Весці БДПУ. Серыя 2. 2018. № 4. С. 73–78

УДК 94(476):[35.08:81’276.6:001]

UDC 94(476):[35.08:81’276.6:001]

# КАДРАВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ НАВУКОВА-ТЭРМІНАЛАГІЧНАЙ КАМІСІІ

# PERSONNEL POTENTIAL OF THE BELARUSIAN SCIENTIFIC TERMINOLOGICAL COMMISSION

**І. І. Шаўчук,**
*доктар гістарычных навук, прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі БрДУ*

**I. Shauchuk,**
*Doctor of History, Professor of the Department of General History, BrSU*

Паступіў у рэдакцыю 25.06.18.

Received on 25.06.18.

Артыкул прысвечаны вывучэнню аднаго з аспектаў пачатковага перыяду арганізацыйнага будаўніцтва навукі ў Беларусі, а менавіта стварэнню яе кадравага патэнцыялу. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі спецыяльная ўвага звернута на выяўленне колькасці штатных супрацоўнікаў Навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамата асветы. Раскрыты даваенныя вытокі фарміравання ў сучаснай гістарычнай навуцы адной статычнай лічбы членаў Камісіі ў 15 чалавек. Даказана недастатковая аргументацыя такой пазіцыі. Зроблена выснова пра неабходнасць разгляду праблемы ў дынаміцы, што дазваляе паказаць рэальныя разнастайныя змены ў кадравым складзе адной з першых навуковых устаноў найноўшага часу і тым самым паставіць пад сумненне папярэднюю дамінантную канцэпцыю.

*Ключавыя словы:* Навукова-тэрміналагічная камісія, штат, кадры, даследчык, вучоны, Інбелкульт, акадэмічная навука, супрацоўнік, патэнцыял.

The paper deals with the study of one of the aspects of the initial period of the organizational construction of science in Belarus, namely, the creation of its human resources. For the first time in the domestic historiography special attention is paid to the identification of the number of staff members of the Scientific and Terminological Commission of the People's Commissariat of Education. The pre-war sources of the formation in the modern historical science of one static figure of the Commission members in 17 people are revealed. The insufficient argumentation of such a position is proved. The conclusion is made on the need to consider the problem within process of development, which allows to display real various changes in the staff of one of the first scientific institutions of the newest time and thus point to the failure of the previous dominant concept.

*Keywords:* Scientific and Terminological Commission, personnel, staff, researcher, scientist, Institute of Belarusian Culture, academic science, employee, potential.

У айчыннай гістарычнай навуцы па тэме навукова-арганізацыйнага акадэмічнага будаўніцтва пасля Кастрычніка 1917 г. сфарміраваўся традыцыйны (нават «кананічны») падыход, канчатковая выпрацоўка якога знайшла ўвасабленне на пачатку 1970-х гг. Сёння ён лічыцца агульнапрынятым і амаль ва ўсіх публікацыях успрымаецца як данасць. Яго сутнасць можна звесці да наступнага: ад пачатку 1921 г. існаваў дэталёвы паэтапны план навуковага будаўніцтва, што рэалізавана ў паслядоўным стварэнні Навукова-тэрміналагічнай камісіі (Навуковая камісія па складанні і апрацоўцы беларускай тэрміналогіі, НТК), на яе базе – Інстытута беларускай культуры (ІБК, Інбелкульт). Завяршэнне рэалізацыі задуманага адбылося з урачыстым адкрыццём 1 студзеня 1929 г. Беларускай акадэміі навук (БАН).

Цяперашнія магчымасці – наяўнасць дакументальнага матэрыялу і, галоўнае, грамадска-палітычныя абставіны – дазваляюць убачыць неаднaзначнасць тагачаснай навукова-арганізацыйнай сітуацыі, яе большую шматколернасць, чым гэта магчыма было заўважыць у савецкі перыяд. Пацвярджае зазначанае аб’ёмісты артыкул П. Ц. Петрыкава, апублікаваны неўзабаве пасля 1991 г. [1]. У ім названыя пытанні ўпершыню атрымалі сістэмнае глыбокае асэнсаванне, нягледзячы на высновы, якія ў пэўнай ступені супярэчылі прыведзеным аўтарам фактам, а таксама логіцы разважанняў, паколькі ўтрымлівалі акрэсленую вышэй «кананічную»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

схему. Аднак артыкул апынуўся па-за ўвагай даследчыкаў. Магчыма, гэтаму паспрыяў сам Пётр Ціханавіч сваім суаўтарствам у калектыўнай манаграфіі 1993 г. выдання, у адпаведным раздзеле якой ім, разам з М. І. Галенчыкам і М. У. Токаравым, выказаны, а па сутнасці замацаваны пазіцыі, супярэчныя прысутным у яго персанальнай публікацыі 1992 г. і характэрныя для 1970-х гг. [2, с. 6–32]. Аўтар дадзенага артыкула апошнія гады сістэматычна звяртае ўвагу на няслушнасць такой абсалютызацыі і неабходнасць удакладнення пазіцый, што набылі сучасныя абрысы больш 45 гадоў таму [3–5]. Тым не менш яго пазіцыя не выклікала ніякай рэакцыі ўвогуле (як і артыкул П. Ц. Петрыкава). Паказальна, што нават падчас міжнароднай канферэнцыі, спецыяльна прысвечанай Інстытуту беларускай культуры з нагоды яго 90-х угодкаў [6], гэтыя меркаванні не толькі не ініцыявалі дыскусіі, але не былі нават згаданы ў асяродку нешматлікіх спецыялістаў. Аналагічная сітуацыя, што да канцэптуальных поглядаў, склалася і на наступнай канферэнцыі, прысвечанай 95-годдзю Інбелкульта [7].

У дадзеным артыкуле зроблена першая спроба спецыяльнага разгляду працэсу вывучэння ў навуковай літаратуры штатнага складу навуковых супрацоўнікаў НТК, паколькі асвятленне дадзенага пытання дазваляе больш дэталёва ўбачыць, а значыць, больш дакладна рэканструяваць практычныя захады па арганізацыі нацыянальнай акадэмічнай навукі. Інтарэс да праблемы выкліканы, у тым ліку, надзвычай канспектыўнай увагай гістарыяграфіі да акрэсленага пытання, пры тым, што ў ёй даволі катэгарычна канстатуецца фактычна адна і тая самая лічба членаў Камісіі.

Абагульненыя звесткі пра асабовы склад НТК у навуковай літаратуры амаль адсутнічаюць. Магчыма, гэта абумоўлена тым, што Камісія разглядалася, як правіла, у якасці перадумовы, базы стварэння ІБК. Калектыўная манаграфія «Інстытут беларускай культуры» адназначна канстатуе, што ў НТК працавала 15 чалавек [2, с. 7]. Гэтую ж лічбу, не прыводзячы спасылак, прадставіў У. І. Навіцкі [8, с. 234], відавочна запазычыўшы з той самай кнігі. Яшчэ раней, на пачатку 1970-х гг., яе прывёў у сваім артыкуле Э. Р. Іофэ [9, с. 205]. Паколькі ніхто з аўтараў не падае спасылак на крыніцы, можна меркаваць прыярытэт належыць У. М. Ігнатоўскаму, які канстатаваў стварэнне «тэрміналагічнай камісіі з 15 асоб» [21, с. 10].

Толькі П. Ц. Петрыкаў першым звярнуў больш пільную ўвагу на склад НТК у дынаміцы: люты – 14 чалавек, май – 16, жнівень – 18 [1, с. 53]. Апошняя лічба адназначна канстатуецца П. І. Брыгадзіным і І. Д. Мацяс у 1998 г. [10, с. 30]. Яна паўторана, традыцыйна без спасылак на крыніцы інфармацыі, першым суаўтарам у індывідуальным артыкуле праз 20 гадоў: «У лютым 1921 г. пры камісарыяце асветы пад кіраўніцтвам В. М. Ігнатоўскага пачала дзейнічаць Навукова-тэрміналагічная камісія ў складзе 18 супрацоўнікаў» [11, с. 65]. Такім чынам, як і ў выпадку з 15-ю членамі, дадзеная лічба экстрапалюецца на ўвесь перыяд існавання Камісіі. Гэта пры тым, што за шэсць гадоў да выхаду першай кнігі з друку зафіксавана адзначаная пазіцыя П. Ц. Петрыкава.

Мной прыводзіліся іншыя даныя, грунтаваныя на архіўнай інфармацыі. Канстатавалася, у прыватнасці, што пры ўтварэнні Навукова-тэрміналагічная камісія складалася з 13 чалавек, але на працягу першых 72-х дзён яе існавання колькасць членаў павялічылася да 15 [4, с. 16]. Тая самая колькасць захоўвалася да ліпеня, пра што можна меркаваць, абапіраючыся на спіс супрацоўнікаў Акадэмічнага цэнтра (АЦ, Акадэмцэнтр)[1], складзенага для атрымання пайкоў за адпаведны месяц 1921 г. [12, арк. 15]. Справаздача аб дзейнасці Акадэмічнага цэнтра за 1921 г., датаваная 12 студзеня 1922 г., называе 16 прозвішчаў [13, арк. 5–5 адв.]. Далейшае даследаванне гэтага пытання дазволіла ўдакладніць першы склад супрацоўнікаў НТК – 14 чалавек, як сцвярджаў П. Ц. Петрыкаў, і выявіць наяўнасць 17 членаў камісіі на канец жніўня 1921 г. Верагодна ёсць сэнс дадаць, што ў жніўні, як высвятляецца, НТК мела ў сваім складзе 24 супрацоўнікаў. У адпаведным да-

1 Арганізацыя працы па стварэнні АЦ пачалася з прызначэння сакратарыяту 27 чэрвеня, загад аб якім быў аддадзены 11 ліпеня 1921 г. Сярод асноўных задач, пастаўленых перад АЦ, у тым ліку былі наступныя: непасрэднае кіраўніцтва ўстановамі, якія ставяць перад сабой чыста навуковую і мастацкую акадэмічную работу (Акадэміі, НДУ, вучоныя таварыствы і г. д.), запрашэнне ў Беларусь і падрыхтоўка ўласных навуковых сіл [15, арк. 4; 1, с. 54]. Існаваў да чэрвеня 1922 г. У перыяд кампаніі па скарачэнні штатаў ліквідаваны ён і Адміністрацыйна-арганізацыйны цэнтр [16, с. 51].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

куменце з усіх занятых на працы ва ўстанове пазначаны «членамі камісіі» 16 і адзін (С. М. Некрашэвіч) – старшынёй. Яшчэ сем займалі наступныя пасады: рэдактар часопіса «Зоркі» (С. Я. Плаўнік), сакратар н[авукова]-мэд[ычнай] (*так ў дакуменце.* – ***І. Ш.***) секцыі (І. М. Галынец), перакладчыкі (Я. І. Васілеўская і В. П. Габрыно(ло)віч), сакратар аддзелу перакладаў (Н. В. Панамарова), карэктар (Н. М. Яноўская), кур'ер (М. Ф. Гучок) [14, арк. 34] (табліца, слупок 3).

Разнастайвае і канкрэтызуе нашы ўяўленні яшчэ адзін дакумент. Ён утрымлівае спіс супрацоўнікаў «Акадэмічнага Цэнтра БССР», што ў жніўні атрымалі ордэры на фатаграфаванне для службовых пасведчанняў (табліца, слупкі 1 і 2) [14, арк. 94].

Дакумент цікавы з некалькіх прычын. Папершае, у ім работнікі, аднесеныя відавочна паводле штатнай прыналежнасці, да дзвюх структурных адзінак – НЛА1[1] і НТК. Прычым большасць згаданых у папярэднім дакуменце асоб паказаны ў штаце НЛА. Па-другое, тут прысутнічае прозвішча Я. Ф. Карскага, які за год да гэтага часу вызначыўся з месцам сталага жыцця – Петраград, хаця зараз, на пачатку 1921 г., і некалькі пазней у беларускіх дзеячаў яшчэ былі спадзяванні на яго сталую прысутнасць у Беларусі; У. В. Тэраўскага, арыштаванага неўзабаве пасля складання гэтага спісу і датэрмінова вызваленага ў 1923 г. [17], і Я. М. Кругера. Заўважу, што Я. Ф. Карскі будзе згаданы ўжо ў якасці правадзейнага члена Інбелкульта толькі адзін раз і толькі ў дзвюх ідэнтычных публікацыях С. М. Некрашэвіча ў 1922 г. [18; 19]. Прыведзены ніжэй архіўны дакумент таксама служыць нагодай задумацца аб дакладнасці нашых сённяшніх уяўленняў пра займанне штатнай пасады ў той час і ў тых навукова-арганізацыйных умовах. Справа ў тым, што згаданыя У. В. Тэраўскі і Я. М. Кругер у тым жа жніўні 1921 г. паказаны як супрацоўнікі Экспедыцыі па вывучэнні беларускай народнай творчасці, якая ўваходзіла ў склад Акадэмічнага цэнтра НКА у якасці асобнай установы [14, арк. 40].

Такім чынам, архіўныя пошукі пакуль не дазваляюць пацвердзіць даныя П. Ц. Петрыкава пра 18 супрацоўнікаў камісіі ў жніўні. Такая колькасць фіксуецца 1 кастрычніка пайменным штатным раскладам Акадэмцэнтра, зацверджаным Наркаматам асветы і штатнай камісіяй Наркамата працы. Праўда, на пачатку спіса «членаў» НТК пазначана: «Старшыня – 1, сакратар – 1, членаў – 18». Вынікае, навуковых работнікаў павінна было б быць 20. Аднак усіх прозвішчаў, уключаючы старшыню і сакратара, пералічана 18 [20, арк. 23 адв]. Улічваючы паказанае, можна сцвярджаць, што агульны склад НТК і да жніўня, і да канца кастрычніка быў большым, чым лічыцца ў сучаснай спецыяльнай літаратуры. Прынамсі, ён не быў статычным. Таму, думаецца, каб пазбегнуць магчымых недакладнасцей «членаў камісіі», з улікам характару іх дзейнасці, лепш было бы называць паводле сучаснай тэрміналогіі «навуковымі супрацоўнікамі». Аднак амаль праз месяц, 28 кастрычніка, іх налічвалася 14 чалавек без С. М. Некрашэвіча (па спісах Акадэмцэнтра паказана яго асноўнае месца працы – намеснік старшыні АЦ): Азбукін, Байкоў, Більдзюкевіч, Бурак, Дашкевіч, Круталевіч, Лёсік, Міхальскі, Міцкевіч, Пятуховіч, Родзевіч, Сушынскі, Цвірка-Годыцкі, Чаржынскі [14, арк. 174, 175]. Гэта даволі паказальна, калі мець на ўвазе пачатак арганізацыйнай дзейнасці Інстытута беларускай культуры з верасня – кастрычніка 1921 г.

[1] НЛА – Навукова-літаратурны аддзел. Створаны 7 лютага і праіснаваў палову года [12, арк. 31]. Паводле палажэння, аддзел павінны быў разглядаць усе пытанні навуковага і навукова-педагагічнага характару і даваць па ім свае заключэнні, прымаць навуковыя творы да друку. У адпаведнасці з задачамі аддзел падзяліўся на тры секцыі: навуковую, навукова-педагагічную і літаратурна-мастацкую. Пры ім дзейнічала яўрэйская навуковая секцыя. За час існавання НЛА яго Навуковая калегія (секцыя) разгледзела 43 рукапісы агульным аб'ёмам 352 друкаваныя аркушы і вырашыла набыць для выдання працы М. Янчука і У. Пічэты. Былі пастаўлены на абмеркаванне работы М. Доўнар-Запольскага; заказаны шэраг падручнікаў вядомым аўтарам; разгледжаны пытанні навукова-асветніцкага характару кшталту з'езда беларускіх навуковых сіл, Інбелкульта, краязнаўчай работы і інш. [15, арк. 9–9 адв.; 12, арк. 34; 1, с. 53]. Навуковая секцыя з самага пачатку вызначыла прыярытэтным напрамкам апрацоўку беларускай тэрміналогіі. У сувязі з гэтым пры НЛА «для чыста практычных мэтаў – складання тэрміналогіі» створана Навукова-тэрміналагічная камісія [18, с. 280].

РЕПОЗІТОРЫЙ БДПУ

**Табліца – Супрацоўнікі Акадэмічнага цэнтра**

| НЛА | НТК | НТК |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| 17 жніўня 1921 г. | | 26 жніўня 1921 г. |
| *1. Байкоў М. Я.* | 1. Некрашэвіч С. М. | 1. Некрашэвіч С. М. |
| *2. Васілеўская Я. І.* | 2. Чаржынскі У. В. | 2. Чаржынскі У. В. |
| *3. Габрыно(ло)віч В. П.* | 3. Азбукін М. В. | 3. Азбукін М. В. |
| *4. Гальнец І. М.* | 4. Більдзюкевіч Л. Л. | 4. Байкоў М. Я. |
| *5. Гучок М. Ф.* | 5. Бурак Ф. Ф. | 5. Більдзюкевіч Л. Л. |
| *6. Дыла Я. Л.* | 6. Дашкевіч Л. У. | 6. Бурак Ф. Ф. |
| 7. Жылуновіч З. Х. | 7. Каранеўскі Я. П. | 7. Дашкевіч Л. У. |
| *8. Лёсік Я. Ю.* | *8. Карскі Я. Ф.* | 8. Дыла Я. Л. |
| *9. Луцэвіч І. Д.* | *9. Кругер Я. М.* | 9. Круталевіч А. П. |
| *10. Міцкевіч К. М.* | 10. Круталевіч А. П. | 10. Лёсік Я. Ю. |
| *11. Панамарова Н. В.* | 11. Міхальскі В. Ф. | 11. Луцэвіч І. Д. |
| *12. Плаўнік С. Я.* | 12. Родзевіч Ч. І. | 12. Міхальскі В. Ф. |
| 13. Раманоўскі А. | *13. Тэраўскі У. В.* | 13. Міцкевіч К. М. |
| 14. Якубоўскі | 14. Цвірка-Годыцкі К. М. | 14. Пятуховіч М. М. |
| *15. Яноўская Н. М.* | | 15. Родзевіч Ч. І. |
| | | 16. Сушынскі Я. Ф. |
| | | 17. Цвірка-Годыцкі К. М. |
| | | *** |
| | | 18. Васілеўская Я. І. |
| | | 19. Габрыно(ло)віч В. П. |
| | | 20. Гальнец І. М. |
| | | 21. Гучок М. Ф. |
| | | 22. Панамарова Н. В. |
| | | 23. Плаўнік С. Я. |
| | | 24. Яноўская Н. М. |

*Заўвага:* Курсівам у слупку 1 выдзелены навуковыя і тэхнічныя супрацоўнікі, якія паводле спісу ад 26.08.1921 г. з'яўляліся штатнымі работнікамі НТК. У слупку 2 – прозвішчы тых, хто не сустракаецца ні ў адным іншым спісе Камісіі.

На шляху выніковай рэканструкцыі навукова-кадравага патэнцыялу Камісіі паўстаюць цяжкасці тэхнічнага характару, абумоўленыя асаблівасцямі справаводства. Сутнасць іх у тым, што вельмі часта праблематычна ўстанавіць асноўнае (штатнае) месца працы многіх асоб. Можна пагадзіцца з меркаваннем П. Ц. Петрыкава, прынамсі ў дачыненні да некаторых членаў НТК, што «спачатку члены камісіі не займалі штатных адзінак... яны працавалі ў розных установах Мінска і атрымлівалі ў НКА аплату за выкананую ў камісіі работу... афіцыйны загад аб персанальным залічэнні асоб у гэтую камісію быў аддадзены толькі 1 кастрычніка 1921 г., аднак з канстатацыяй, што частка з іх працуе з 20 лютага, другая – па меры выканання сваіх абавязкаў». Разам з тым, гэтая ў цэлым слушная выснова супярэчыць пазіцыі аўтара, прадстаўленай у тым жа абзацы. Паводле яе лагічна вынікае, што першы (лютаўскі) склад НТК перманентна папаўняўся новымі супрацоўнікамі. Пра змяншэнне іх колькасці П. Ц. Петрыкаў не згадвае нічога. Таму можна зрабіць выснову, што, супярэчачы сам сабе, ён налічвае на жнівень не 18, а 19 чалавек. Вучоны слушна, хаця і цьмяна заўважае, што «ў далейшым сярод старшынь і сакратароў секцый, а таксама некаторых членаў камісіі былі змены». Выклікае вялікія сумненні яго фраза пра першы загад аб асабовым складзе НТК толькі 1 кастрычніка [1, с. 53, 54][1]. Верагодна, гэта сапраўды быў першы загад, але новага 1921/22 бюджэтнага года, які і пачынаўся з указанай даты.

Гэтыя і іншыя факты дазваляюць меркаваць, што ў той час, у той канкрэтнай сітуацыі паняцце «штатны супрацоўнік» мела даволі размытыя рамкі і для НЛА, і для НТК. Таму можа быць ёсць сэнс не абсалютызаваць «штатную сітуацыю» ў Наркамаце асветы на 1921 г., а мець на ўвазе штатных работнікаў Акадэмцэнтра, якія ў розны час альбо адначасова выконвалі пэўныя функцыі ў яго розных структурных падраздзяленнях, нягле-

[1] Цікава, што паводле меркавання П. Ц. Петрыкава менавіта 1 кастрычніка 1921 г. прызначаны сакратар ІБК С. С. Шпакаў [1, с. 55].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

дзячы на канкрэтную службовую «прапіску» (увядзенне звыклай для нас штатна-акладнай сістэмы бярэ пачатак толькі з 1927 г.). Акцэнтаванне ж прыналежнасці да адной з інстытуцый матывавалася бягучымі, здаецца, у першую чаргу бытавымі (паёк, аплата, жыллёвыя льготы, размеркаванне пасылак АРА[1] і г. д.), грамадска-культурнымі і навукова-арганізацыйнымі патрэбамі. Думаецца, такая сітуацыя працягвалася да чэрвеня 1922 г., да ліквідацыі Акадэмцэнтра.

Неўзабаве пераважная большасць навуковых супрацоўнікаў НТК увайшла ў склад Інстытута беларускай культуры, заснаванага восенню 1921 г. У. М. Ігнатоўскі, можна быць упэўненым, дакладна ўяўляў і канструяваў навукова-арганізацыйныя працэсы. Улічваючы гэта, дапушчальна меркаваць, што яго фраза: «Інбелкульт у пачатку 1922 г. упітвае ў сябе Тэрміналагічную камісію, каторая перастае існаваць самастойна» [21, с. 12], тычылася, без сумненняў, менавіта кадравага патэнцыялу ўстановы.

Такім чынам, беларуская пасляваенная гістарыяграфія, сцвярджаючы, што НТК стала грунтам стварэння Інбелкульта, а значыць, апасродкавана і Акадэміі навук, не надала спецыяльнай увагі высвятленню рэальнага кадравага патэнцыялу Камісіі. У сучаснай навуковай літаратуры дамінуе адна дакладная лічба – 15 супрацоўнікаў, хаця ў 1990 – пачатку 2000-х гг. з'яўляюцца і іншыя погляды. Сутнасць іх заключаецца ў адмаўленні статычнасці навукова-кадравай сітуацыі ў НТК і раскрыцці заяўленага пытання ў дынаміцы, а таму немагчымасці акрэслення колькасці супрацоўнікаў Камісіі выключна адной лічбай на працягу ўсяго перыяду самастойнага існавання НТК. Гэтыя пазіцыі, аднак, застаюцца незаўважанымі навуковай супольнасцю. Даследаванне акрэсленага пытання дазваляе канстатаваць недастатковую прапрацоўку праблемы і перспектыўнасць яе далейшага спецыяльнага вывучэння.

[1] Амерыканская арганізацыя дапамогі (American Relief Administration, ARA) была створана ў 1919 г. для дапамогі Еўропе. З 1921 г. − у Беларусі. Функцыянавала ў СССР да 1923 г.


Літаратура

1. *Петрыкаў, П. Ц.* Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў / П. Ц. Петрыкаў // Весці АН РБ. Сер. гуманітар. навук. – 1992. – № 5–6. – С. 52–70.
2. Інстытут беларускай культуры / М. П. Касцюк [і інш.] ; рэдкал.: М. А. Барысевіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 255 с.
3. *Шаўчук, І. І.* Стварэнне Інстытута беларускай культуры (да 80-годдзя) / І. І. Шаўчук // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Філасофія. Гісторыя. Псіхалогія. Педагогіка. Літаратуразнаўства. – 2002. – № 1. – С. 24–29.
4. *Шаўчук, І. І.* Гуманітарныя навукі ў сацыяльнай гісторыі Беларусі (20–30-я гады ХХ ст.) / І. І. Шаўчук. – Брэст : БрДУ, 2007. – 279 с.
5. *Шаўчук, І.* Інстытут беларускай культуры: арганізацыйнае станаўленне і развіццё / І. Шаўчук, Г. Карзенка // Наука и инновации. – 2012. – № 2. – С. 53–57.
6. Институт белорусской культуры и становление науки в Беларуси: к 90-летию создания Института белорусской культуры : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 8–9 декабря 2011 г. / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Белорус. наука, 2012. – 769 с.
7. Інстытут беларускай культуры: здабыткі, значэнне, вынікі дзейнасці : матэрыялы Міжнар. круглага стала, прысвечанага 95-годдзю Інстытута беларускай культуры, Мінск, 10 лістапада 2017 г. / Цэнтр даследаванняў бел. культуры, мовы і літ. Нац. акадэміі навук Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2017. – 116 с.

References

1. *Petrykau, P. Ts.* Instytutu belaruskay kultury – 70 gadou / P. Ts. Petrykau // Vestsi AN RB. Ser. gumanitar. navuk. – 1992. – № 5–6. – S. 52–70.
2. Instytut belaruskay kultury / M. P. Kastsyuk [i insh.] ; redkal.: M. A. Barysevich [i insh.]. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1993. – 255 s.
3. *Shauchuk, I. I.* Stvarenne Instytuta belaruskay kultury (da 80-goddzya) / I. I. Shauchuk // Vesnik Brestskaga universiteta. Filasofiya. Gistoryya. Psikhalogiya. Pedagogika. Litaraturaznaustva. – 2002. – № 1. – S. 24–29.
4. *Shauchuk, I. I.* Gumanitarnyya navuki u satsyyalnay gistoryi Belarusi (20-30-ya gady XX st.) / I. I. Shauchuk. – Brest : BrDU, 2007. – 279 s.
5. *Shauchuk, I.* Instytut belaruskay kultury: arganizatsyynaye stanaulenne i razvittsyo / I. Shauchuk, G. Karzenka // Nauka i innovatsii. – 2012. – № 2. – S. 53–57.
6. Institut belorusskoy kultury i stanovleniye nauki v Belarusi: k 90-letiyu sozdaniya Instituta belorusskoy kultury : materialy Mezhdunar. nauch. konf., Minsk, 8-9 dekabrya 2011 g. / redkol.: A. A. Kovalenya [i dr.]. – Minsk : Belorus. nauka, 2012. – 796 s.
7. Instytut belaruskay kultury: zdabytki, znachenne, vyniki dzeynastsi : materyyaly Mizhnar. kruglaga stala, prysvchanaga 95-goddzyu Instytuta belaruskay kultury, Minsk, 10 listapada 2017 g. / Tsentr dasledavannyau bel. kultury, movy i lit. Nats. akademii navuk Belarusi. – Minsk : Prava i ekanomika, 2017. – 116 s.


РЕПОЗИТОРИЙ БрГУ

8. *Навіцкі, У.* Паслярэвалюцыйнае нацыянальна-культурнае адраджэнне: дасягненні, супярэчнасці, абрыў (1917 – пачатак 30-х гг.) / У. Навіцкі // Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск : Экаперспектыва, 1996. – Гл. 5. – С. 196–266.
9. *Іофе, Э. Р.* Першыя крокі / Э. Р. Іофе // Полымя. – 1972. – № 2. – С. 205–209.
10. *Брыгадзін, П. І.* Усевалад Ігнатоўскі: паліт. дзеяч, вучоны / П. І. Брыгадзін, І. Д. Мацяс. – Мінск : Полымя, 1998. – 96 с.
11. *Бригадин, П. И.* Всеволод Макарович Игнатовский. 19.04.1881–04.02.1931 / П. И. Бригадин // Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1941): 100 лет университетскому образованию и науке в Беларуси / С. В. Абламейко [и др.] ; под общ. ред. С. В. Абламейко ; науч. ред. О. А. Яновский. – Минск : БГУ, 2017. – С. 62–74.
12. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 519.
13. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 514.
14. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 518.
15. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 516.
16. Реорганизация Наркомпроса ССРБ // Вестник Наркомпроса ССРБ. – 1922. – № 7–8. – С. 51.
17. *Гесь, А.* Тэраўскі Уладзімір Васілевіч / А. Гесь, У. Ляхоўскі // Энцыкл. гіст. Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1994. – Т. 6. Кн. 1. – С. 558.
18. С. Н. Інстытут Беларускай Культуры / С. Н. // Адраджэньне. – 1922. – Сш. 1. – С. 278–282.
19. С. Н. Інстытут Беларускай Культуры / С. Н. // Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. – 1921. – № 2. – С. 13–15.
20. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 104.
21. *Ігнатоўскі, У.* Старонка з гісторыі культурнага будаўніцтва ў БССР / У. Ігнатоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 12. – С. 10–27.

8. *Navitski, U.* Paslyarevalyutsyynaye natsyyanalna-kulturnaye adradzhenne: dasyagnenni, supyarechnastsi, abryu (1917 – pachatak 30-kh gg.) / U. Navitski // Gistoryya kultury Belarusi / L. Lych, U. Navitski. – Minsk : Ekaperspektyva, 1996. – Gl. 5. – S. 196-266.
9. *Iofe, E. R.* Pershyya kroki / E. R. Iofe // Polymya. – 1972. – № 2. – S. 205–209.
10. *Brygadzin, P. I.* Usevalad Ignatouski: palit. dzeyach, vuchony / P. I. Brygadzin, I. D. Matsyas. – Minsk : Polymya, 1998. – 96 s.
11. *Brigadin, P. I.* Vsevolod Makarovich Ignatovskiy. 19.04.1881–04.02.1931 / P. I. Brigadin // Intellektualnaya elita Belarusi. Osnovopolozhniki belorusskoy nauki i vysshego obrazovaniya (1919–1941): 100 let universitetskomu obrazovaniyu i nauke v Belarusi / S. V. Ablameyko [i dr.] ; pod obshch. red. S. V. Ablameyko ; nauch. red. O. A. Yanovskiy. – Minsk : BGU, 2017. – S. 62–74.
12. Natsyyanalny arkhiu Respubliki Belarus (NARB). – F. 42. Vop. 1. Spr. 519.
13. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 514.
14. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 518.
15. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 516.
16. Reorganizatsiya Narkomprosa SSRB // Vestnik Narkomprosa SSRB. – 1922. – № 7–8. – S. 51.
17. *Ges, A.* Terauski Uladzimir Vasilevich / A. Ges, U. Lyakhouski // Entsykl. gist. Belarusi : u 6 t. – Minsk, 1994. – T. 6. Kn. 1. – S. 558.
18. S. N. Instytut Belaruskay Kultury / S. N. // Adradzhenne. – 1922. – Ssh. 1. – S. 278–282.
19. S. N. Instytut Belaruskay Kultury / S. N. // Vestnik Narodnogo Komissariata Prosveshcheniya SSRB. – 1921. – № 2. – S. 13–15.
20. NARB. – F. 42. Vop. 1. Spr. 104.
21. *Ignatouski, U.* Staronka z gistoryi kulturnaga budaunitstva u BSSR / U. Ignatouski // Balshavik Belarusi. – 1928. – № 12. –S. 10–27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ